
МАЛІТВЫ
МЕНСК
САМВЫДАТ
1989

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/11 sprava 168

✝

# ХРЫСТОС І АЙЧЫНА

раскрыжаваньне кат завершыў ---
аблашчыў кужаль кроў Жыцьця ---
так: Плашчаніца — гэта Першы
мой Бел-Чырвона-Белы Сьцяг!..

✝

У Менску,
20 ліпеня 1989 г.

Валяньціне
сьпеўнай пакутніцы
Адраджэньня —
зьнічка

ЗЬНІЧ

# МАЛІТВЫ ЗА БЕЛАРУСЬ

ПЕРШЫ ЗБОРНІК НА РАДЗІМЕ

МЕНСК
1989

# Ядтульны часці
# Вечнае цяпер

сустрэне за м я ж о й Хрыстос адзіны
душу пакутную,што ўздымецца ў блакіт,
з сабою узяўшы зорныя хвіліны...
...а тлумны час--адыдзе ў Нябыт...

# Ноч ля ўзарванага храма
# Хрыста Спасіцеля

...таго злачынства адгалоскі--
адчаю поўныя равы:
магілы Волгі...рускай вёскі...
і белакаменнай Масквы...

шчырые д'яблава навала...
і усё ж Расію--не сьсячы:
Ты--Праваслаўе захавала...
і Дух Твой--сьвеціцца ўначы!..

* * *

ня слухаюць словы...учынкі--ня чуюць...
з сутоньня--адчай--да сьвітаньня...
начамі--малюся...пад сонцам--начую...:
засвойваю
М о в у   м а ў ч а н ь н я ...

* * *

О,Хрысьце,Ты спрадвечнае жніво
ад-дольных душ сярпом праменным праўдзіш:
наш час і лёс,сьляпы адчай і радасьць,
і зло,і сьвятасьць--рушаць да яго...

# На скон народа

*Матывы Лермантава і Айтматава.*

Манкуртам стаў нявольнік лёсу.
Маўчыць. Сыноў не пазнае.
Ні болю ўжо, ні прагі помсты:
чароўны круг на галаве...
Манкурт!..навошта галашэньне
і мітусьня--пасьля пакут?..
Ня будзе т у т  уваскрашэньня--
адбыўся цэсараў прысуд.

...Згарэў вянок вякоў...Цяпер вянцом цярновым,
абвітым лаўрамі, зацiснулі чало...
І змоўкла спадчыннае Слова...
І згасла Боскае Сьвятло...

А цар спатоліўся крывёю.
Дае палёгку нездарма:
шляхотны дух над той зямлёю
сканаў. Ратунку ўжо няма...
І што за дзіва?..адусюды
на лоўлю шчасьця і чыноў
шыбуюць процьмы ўцекачоў--
і Герастраты, і Іуды...
Гвалтуюць д'яблавы сыны
чужыя звычаі і мову...
Затое ўласныя чыны
уладкавалі адмыслова!..
Скрышылі Храмы і Муры--
што ім усім да нашай славы!..
...на мерцьвяках--пасьля аблавы--
свой пір, ганебны і крывавы,
спраўляюць каты й гандляры!..

А вы, тутэйшыя Дантэсы,
падпанкі подласьці нахрапістых братоў,
Сьвятыню-спадчыну ў пракруставыя "крэсы"
за срэбнік кідаеце колькі ўжо вякоў?..
натоўпам сквапным раскашуеце ля тронаў,
на вочы матчынныя селі,
крумкачы...
схаваліся за шыльдамі законаў,
і суд, і праўда перад вамі--усё маўчы!..
Але ёсьць Божы Суд, нэперсьнікі распусты!
Т а м ажыве закатаваны Край...
Нямы народ свае раскрые вусны--
і здасца вам:
"О, Божа! Пакарай!.."

...Усё узновіцца, што той абруч чароўны
сьцёр з памяці, зь зямлі, з душы...
І кожны--уваскрашальнае пакуты поўны--
мо ўчуе:
"...Йдзі...
І болей не грашы..."

Вякі плывуць,
а Ён--
раскрыжаваны,
жывы...
ў крыві цячэ
цьвікоў іржа...
і род людзкі
нячыстым
апантаны
ня мае сілы
зьняць Яго
з крыжа...

* * *

чорна-белыя плыні Быцьця
я кранаю пальцамі лёсу...
мне бел-чырвона-белы сьцяг
адгукаецца бацькам хросным...

* * *

...Верай...Надзеяй...Каханьнем
Троіца таемна мігціць...
тое,што трацім сьвітаньнем,
мусім сутоньнем набыць...

* * *

...з россыпу слоў-крышталю,
прэлюдыяй і высновай,
промнем Хрыстовай хвалі
бліськне
Боскае
Слова...



Рэдактар С т р а ц і л а т .

Мастак Кастусь Якаў.

Літаратурны дадатак да часопіса праваслаўнае моладзі "Праваслаўная думка".

Часопіс "Праваслаўная думка" не з'яўляецца органам афіцыйных царкоўных уладаў і адлюстроўвае думку незалежнае рэдакцыі.

Бясплатна. Нумар выдадзены коштам рэдактара.

Наклад 10 000 асобнікаў.

Ахвяруйце грошы ў фонд выданьня!